полностью сосредоточилось на проведении агентурной, разведывательной, специальной и диверсионной работы в тылу противника. Чтобы движение не прекращалось, они должны были самоочищаться от агентов противника, расчищать от врага районы дислокации и осуществлять расправу и правосудие. Народные восстания против оккупантов вспыхивали не сами по себе… Поэтому скромная фигура оперативного работника играла отнюдь не последнюю роль в неумолимом продвижении народных мстителей по оккупированной врагом территории Ленинградской области.

УДК 343.97(476)[19]

***І.А. Саракавік***

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВІДАЎ ЗЛАЧЫННАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XX ст.: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫ АСПЕКТ

Многія даследчыкі аналізуюць розныя віды злачыннасці адносна канкрэтнага гістарычнага этапу. Аднак навуковых прац, прысвечаных даследу злачыннасці і яе відаў на матэрыяле значнага гістарычнага перыяду, практычна не існуе. Між іншым веданне пра гэта дазваляе лепш асэнсаваць супрацьпраўныя дзеянні злачынных элементаў і ў той жа час больш эфектыўна спрагназаваць магчымыя новыя накірункі дзейнасці праваахоўных органаў, найперш унутраных спраў, і ў сувязі з гэтым прыняць неабходныя меры. У той жа час аналіз відаў злачынстваў дазваляе лепш зразумець сацыяльна-эканамічнае становішча розных сацыяльных слаёў насельніцтва, каштоўнасці грамадства і дзяржавы ў канкрэтны перыяд гісторыі.

Яшчэ з часоў ранняга Сярэднявечча вылучаны віды злачынстваў, якія сталі традыцыйнымі ў наступныя стагоддзі з пэўнай карэляцыяй на адпаведны гістарычны перыяд. Гэта крадзяжы, разбоі, забойствы, махлярства, замах на грамадскі і дзяржаўны лад і інш. Па сведчанні вядомага прафесара І.А. Маліноўскага, у перыяд існавання ВКЛ былі вядомыя 18 відаў злачынстваў. Асобна выдзяляецца замах на асобу і маёмасць: наход і наезд, разбой; замах на маёмасць: рабунак, крадзёж.

Характэрна, што значная частка з іх таксама адзначана ў XIX ст., хоць і з больш удасканаленым зместам. Віды злачынстваў стасаваліся з новымі грамадскімі адносінамі, у перыяд станаўлення і развіцця капіталізму улічвалі эканамічнае развіццё як у цэлым, так і асобных груп насельніцтва, ступень распрацаванасці крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. Асноўныя злачынствы – супраць уласнікаў і прыватнай уласнасці. Рост гарадоў і насельніцтва ў іх прывяло адначасова і да росту колькасці злачынстваў, іх відаў і пэўнай спецыялізацыі. Напрыклад, меліся разнавіднасці крадзяжоў: з вазоў, хатнія, карманныя, вулічныя, дарожныя і інш. Яўнай тэндэнцыяй стаў паступовы пераход ад насільных відаў злачыннасці, такіх як разбоі, рабункі (хоць яны і працягвалі існаваць), да ненасільных, больш таемных.

На пачатку XX ст., як сведчыць статыстыка, у Расійскай імперыі на першым месцы былі крадзяжы, колькасць якіх ў тры разы перавышала колькасць рабункаў і ў чатыры разы – забойстваў. Такое становішча тлумачыцца ў тым ліку і тым, што за бандытызм давалі вялікія тэрміны турэмнага зняволення або нават павешанне. Таму больш распаўсюджанымі сталі крадзяжы, рабаванні, вымагальніцтва, махлярства.

Першая сусветная і грамадзянская войны, новы грамадскі і дзяржаўны лад на савецкай аснове – усё гэта адбілася на крымінагенным становішчы на тэрыторыі Беларусі. Сярод відаў злачынстваў сталі выдзяляцца палітычны і эканамічны бандытызм, пагромы, рабаванні, самагонаварэнне. Улічваючы розныя віды злачынстваў, Наркамат юстыцыі ССРБ у ліпені 1921 г. сістэматызаваў крымінальна-прававыя нормы і ўстанавіў пералік асноўных відаў злачынстваў у мэтах паляпшэння дзейнасці праваахоўных органаў. Да контррэвалюцыйных злачынстваў адносіліся здзяйсненне выбухаў і падпалаў, агітацыя супраць савецкай улады, шпіянаж, бандытызм, невыкананне распаражэнняў Савецкай улады. Службовымі злачынствамі сталі лічыцца безгаспадарчасць, крадзёж народнага дабра, хабарніцтва, вымагальніцтва, грубасць і бюракратызм, а таксама ўхіленне ад выканання грамадзянскіх абавязкаў – дызертырства, невыкананне харчпадатка і гужавой павіннасці. Да агульнакрымінальных злачынстваў адносілі забойства, згвалтаванне, самавольнае высяканне лесу, патрава, падробка дакументаў, п’янства, выраб і продаж спіртных напояў, пераход мяжы, махлярства, спекуляцыя.

Першы Крымінальны кодэкс БССР 1924 г. дэталізаваў віды злачынстваў, пачынаючы з дзяржаўных (контррэвалюцыйныя і супраць парадку кіравання) і заканчваючы парушэннем правіл, якія ахоўваюць народнае здароўе, грамадскую бяспеку і грамадскі парадак. Паказальна, што злачынствы супраць жыцця, здароўя, свабоды і годнасці асобы былі аднесены толькі да пятага па ліку віду злачыннасці, на першае месца выступалі інтарэсы дзяржавы. Кодэкс таксама прадугледжваў службовыя, гаспадарчыя, маёмасныя, воінскія злачынствы, парушэнне правіл аб аддзяленні царквы ад дзяржавы. У цэлым Кодэкс быў прасякнуты класавым падыходам. Самыя суровыя меры пакарання, ажно да расстрэла, прадугледжваліся за контррэвалюцыйныя злачынствы. Крымінальная адказнасць пачыналася з 14 гадоў.

Для гэтага перыяду былі характэрныя і такія віды злачынстваў, як кантрабанда, пераход мяжы. Масавымі і распаўсюджанымі ў гарадах з’яўляліся маёмасныя: кваліфікаваныя і простыя крадзяжы, ашуканства, разбоі, рабункі, канакрадства і падпалы, забойствы, хабарніцтва і таемнае вінакурэнне ў сельскай мясцовасці.

Асаблівая частка Крымінальнага кодэкса БССР 1960 г. ужо ўтрымлівала 11 відаў злачыннасці: злачынствы дзяржаўныя, супраць сацыялістычнай уласнасці, жыцця, здароўя, свабоды і годнасці асобы, супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян, асабістай уласнасці грамадзян, а таксама гаспадарчыя, службовыя, воінскія злачынствы, супраць правасуддзя, парадку кіравання, грамадскай бяспекі, грамадскага парадку.

Савецкі ўрад імкнуўся скасаваць прычыны злачыннасці больш жорсткімі правапрымяняльнымі сродкамі, пра што сведчыць пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 23 ліпеня 1966 г. № 571 «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю», а таксама Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб узмацненні адказнасці за хуліганства» ад 26 ліпеня 1966 г. і пастанова гэтага ж органа аб парадку прымянення дадзенага акту. За дзесяць гадоў дзеяння гэтага Указа у СССР было арыштавана і

асуджана 2,5 млн чалавек, а за дробнае хуліганства прыцягнута да адказнасці 18 млн. чалавек. МУС СССР прызнала, што гэтыя меры станоўчых вынікаў не далі. Больш таго, істотна ўзрос узровень рэцыдыўнай злачыннасці, што прывяло да яшчэ большага ўскладнення крымінальнага становішча, асабліва ў дачыненні да цяжкіх і складаных супрацьпраўных замахаў. Да таго ж злачыннасць маладзела. Тэмпы росту злачыннасці непаўналетніх па пяцігодках пачынаючы з 1966 г. складалі 14–17 %.

У 1999 г. быў прыняты Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, які з апошнімі папраўкамі і дапаўненнямі ад 9 сакавіка 2023 г. дзейнічае і цяпер. У яго ўнесены такія новыя віды супрацьпраўных дзеянняў, як генацыд, экацыд, стварэнне незаконнага ўзброенага фарміравання, шэраг злачынстваў, звязаных з тэрарызмам, захопам будынкаў і збудаванняў, змова ці іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады, утварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім і інш.

Гісторыка-прававы аналіз відаў злачынстваў на працягу XX ст. сведчыць пра тое, што, у сутнасці, на працягу стагоддзя накіраванасць відаў злачыннасці практычна не мянялася. У той жа час назіраецца яскравая тэндэнцыя ўсё большага пераходу ад традыцыйных відаў злачынстваў (крадзяжы, рабаванні, хуліганства і інш.) да больш складаных відаў, асабліва з канца 1980-х гг., уключаючы арганізаваную злачыннасць, карупцыю, адмыванне грошовых сродкаў і т. п. Глабалізацыя і інфармацыйныя тэхналогіі спарадзілі кіберзлачынства, уключаючы хакерскія атакі, інтэрнэт-махлярства і крадзеж дадзеных. Такая трасфармацыя тлумачыцца як сацыяльна-эканамічнымі, тэхналагічнымі, так і палітычнымі зменамі ў свеце і Рэспубліцы Беларусь. Статыстыка сведчыць, што на тэрыторыі Беларусі пры пэўнай дэмакратызацыі на працягу невялікіх перыядаў назіраўся рост злачыннасці і яе розных відаў. Пры ўмацаванні ўлады злачыннасць трымалася пад кантролем і нават зніжалася. Гэтаму садзейнічалі як адпаведныя часу нарматыўныя прававыя акты, так і дзейнасць праваахоўных органаў, у тым ліку і органаў унутраных спраў Беларусі.

Адзначаная трасфармацыя відаў злачыннасці на тэрыторыі Беларусі патрабуе адпаведнай рэакцыі праваахоўнай сістэмы і крымінальных нормаў права, каб эфектыўна рэагаваць на новыя выклікі і пагрозы часу.

УДК 351.74

***С.А. Семенова***

## ОРГАНИЗАЦИЯ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ УГОЛОВНОГО РОЗЫСКА БССР В КОНЦЕ 60–70-е гг. XX в.

Период со второй половины 60-х по 70-е годы XX в. для аппаратов уголовного розыска характеризуется серьезной работой по перестройке всей их деятельности с учетом новых задач, которые встали перед государством и органами внутренних дел в условиях провозглашенного курса на демократизацию общественной жизни. Опираясь на накопленный опыт, организацию и тактику борьбы уголовного розыска с преступностью, необходимо было привести их правовые основы и организацию деятельности в соответствие с изменившимися социальными условиями, требованиями дальнейшего укрепления законности и правопорядка. В практическом плане это означало добиться того, чтобы уголовно-розыскная служба обеспечивала своевременное предотвращение и пресечение правонарушений, быстрое и полное раскрытие наиболее опасных преступлений, а также розыск преступников. Уголовный розыск по-прежнему оставался одной из ведущих служб органов внутренних дел, находящейся на переднем крае борьбы с преступностью. Хотя в рассматриваемый период уровень преступности в сравнении с 50-ми гг. XX в. существенно снизился, а темпы ее прироста были значительно ниже темпов роста численности населения в стране, проблема борьбы с преступными посягательствами на жизнь и здоровье людей, на государственную и общественную собственность, личное имущество граждан оставалась еще довольно острой. Особую озабоченность вызывало количество преступлений, совершаемых рецидивистами, а также лицами, которые в момент совершения правонарушений не работали и не учились. Не меньшую тревогу в обществе порождали хулиганские проявления и преступления несовершеннолетних. В начале 70-х гг. XX в., как свидетельствуют данные, уголовная преступность составляла значительную часть опасных деяний, совершаемых в республике. Почти $^2/_3$ всех преступлений, совершаемых в данный период, составляли убийства, грабежи, разбои, кражи государственного и личного имущества, изнасилования, хулиганства, угоны автомототранспорта, мошенничества, поджоги. Создавшееся положение требовало от милиции приложить максимум усилий для ликвидации данных негативных проявлений.

Основные направления работы уголовного розыска, организация его практической деятельности, ее правовые основы были определены целым рядом нормативных правовых актов, изданных в этот период. Перечислим лишь некоторые из них. 23 июля 1966 г. ЦК КПСС и Совет Министров СССР приняли Постановление «О мерах по усилению борьбы с преступностью». Этот акт обязывал партийные и государственные органы принять решительные меры к наведению образцового общественного порядка в городах, районах и населенных пунктах; обеспечить надежную охрану интересов страны и граждан от преступных посягательств воров, грабителей, хулиганов и других преступников. Перед правоохранительными органами была поставлена задача вывести на новый качественный уровень работу по раскрытию преступлений, а также по своевременному пресечению преступной деятельности антиобщественных элементов. Вводилась повышенная административная и уголовная ответственность за хулиганские действия, учреждался гласный административный надзор милиции за рецидивистами и другими опасными преступниками, а также за лицами, освобожденными из мест лишения свободы.

19 ноября 1968 г. ЦК КПСС и Совет Министров СССР приняли Постановление «О серьезных недостатках в деятельности милиции и мерах по дальнейшему ее укреплению», в котором значительное место уделялось мерам по улучшению качественного состава кадров уголовного розыска и других служб милиции, а также по широкому использованию достижений науки, техники и научных методов управления в области борьбы с преступностью. Так, 8 июня 1973 г. Президиум Верховного Совета СССР принял Указ «Об основных обязанностях и правах советской милиции по охране общественного порядка и борьбе с